УДК 902/904

# ПЛІНФА З СЮЖЭТНАЙ ВЫЯВАЙ З ЗАМКАВАЙ ГАРЫ Ў ГРОДНА

**Касюк А. Ф.**
Установа культуры
"Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей"
(г. Гродна, Рэспубліка Беларусь)

Анатацыя. У артыкуле разгледжаны ўнікальны прадмет – фрагмент плінфы з сюжэтнай выявай, якая была знойдзена на Замкавай гары ў Гродна. Асноўным элементам з'яўляецца заамарфная фігура, па абодва бакі ад якой размешчаны расліна і яшчэ адна фігура. Падчас археалагічных даследаванняў Замкавай гары былі выяўлены плінфы з геаметрычным арнаментам, кірылічным надпісам. Знаходка цэглы з сюжэтнай выявай дапаўняе рад артэфактаў такога тыпу і з'яўляецца ўзорам мастацтва нашых продкаў.

Ключавыя словы: плінфа, выява, XII ст., Замкавая гара, Гродна.

Summary. The article presents a unique item – a fragment of a plinth with a plot image, which was found on Zamkavaja hara in Hrodna. The main element is a zoomorphic figure, on either side of which there is a plant and another figure. During archaeological research on Zamkavaja hara, plinths with geometric ornaments and Cyrillic inscriptions were discovered. The discovery of a brick with a plot image complements a number of artifacts of this type and is an example of the art of our ancestors.

Key words: Plinth, picture, 12th century, Zamkavaja hara, Hrodna.

Гродна з'яўляецца адным са старэйшых гарадоў Беларусі, у пачатку XII ст. – канцы XIV ст. быў цэнтрам Горадзенскага княства. У старажытнарускі перыяд тут, як у Полацку, Тураве, Віцебску, Навагрудку, узводзіліся мураваныя пабудовы з выкарыстаннем адмысловай цэглы – плінфы. На дзядзінцы ў Гродна ў XII ст. існавалі Ніжняя царква, церам (хорам), абарончыя сцены. На пасадзе размяшчаліся Барысаглебская (Каложская) царква, Прачысценская царква [4, с. 38-45; 5, с. 18-21]. У XX ст. на Замкавай гары ў Гродна быў знойдзены фрагмент плінфы з незвычайнай сюжэтнай выявай. Мэтай прадстаўленага артыкула з'яўляецца аналіз асноўных характарыстык дадзенага артэфакта.

Плінфа (ад грэч. plinthos – цагліна) – шырокая і плоская абпаленая цэгла. Для яе характэрна квадратная (пазней прамавугольная) форма і невялікая (да 4–5 см) таўшчыня. Для архітэктурных дэталяў (пілястры, лапаткі) выкарыстоўвалі паўкруглую і трапецападобную плінфу. Выраблялі плінфу ў спецыяльных формах з драўляным дном ці без яго. Каб пазначыць сваю прадукцыю, цагельнікі выразалі ў бакавых сценках і на дне драўляных формаў знакі. Полацкая і віцебская плінфа мела знакі на тычках і адным з шырокіх бакоў, гродзенская – толькі на тарцах. Знакі на плінфе мелі выгляд літар, крыжыкаў, трызубцаў, стрэлак [6].

Плінфа з сюжэтнай выявай, якая паходзіць з Замкавай гары ў Гродна, мае наступныя памеры: яе шырыня складае 19,2 см, таўшчыня 3,8–4,5 см, максімальная захаваўшаяся даўжыня – 10 см (мал. 1). Зыходзячы з дадзеных метрычных паказчыкаў, верагодна, яна мела прамавугольную форму. Верхняя пасцель (шырокі бок плінфы, які падчас яе вытворчасці ў форме знаходзіўся зверху), увагнутая.

На верхняй пасцелі плінфы па сырой паверхні прыстасаваннем з цвёрдай асновай была нанесена выява, якая ўяўляе сабой сюжэтную кампазіцыю з заамарфнай істотай у цэнтры. Асноўнай фігурай з'яўляецца птушка (ёсць клюў (?)) ці іншая жывёла (ёсць вушы). Яе акруглая галава размешчана ў профіль. Вока мае акруглую форму з кропкай у цэнтры. Цела адлюстравана ў выглядзе трохвугольніка (?), утворанага падвойнымі лініямі, якія разыходзяцца ад узроўню шыі істоты. Бліжэй да ніжняй часткі цела (тут знаходзіцца край фрагмента плінфы) у абодва бакі ад яе ідуць дугападобныя лініі, на якіх маюцца штрышкі (лісце ці іголка (?), пер'е (?)). Цела істоты і лініі ў ніжняй частцы ўпрыгожаны наколамі акруглай (пераважна) і кроплепадобнай формаў. Дыяметр наколаў – 1–2 мм. Шырыня ліній, якія ўтвараюць фігуру – таксама 1–2 мм.

З левага боку ад істоты змешчана выява расліны, верагодна – дрэва (?). Яе характарызуюць ствол з галінкамі, на якіх штрышкамі паказаны лісце ці іголка. Расліна знаходзіцца на ўмоўным пагорку, адлюстраваным дзвюма лініямі, якія сыходзяцца пад тупым вуглом.

З правага боку ад істоты змешчана яшчэ адна фігура, якая зроблена пры дапамозе плаўных ліній. Магчыма, гэта вельмі схематычная выява жывёлы (каня (?)). Прыкладна ў цэнтральнай частцы па даўжыні яе перасякае прамая лінія, якая ідзе ад краю пліфы і сканчваецца ў вобласці фігуры. Паміж гэтым элементам і заамарфнай істотай аўтар выявы (?) правёў па сырой паверхні пальцам, у выніку чаго застаўся след умоўна ў выглядзе літары L. Сляды вапнавай рошчыны на паверхні плінфы ўказваюць на тое, што яна была выкарыстана пры будаўніцтве.

Абставіны, пры якіх была знойдзена плінфа з выявай, а таксама месца яе выяўлення, нам, нажаль, невядомыя. Арыентуючыся на наяўныя метрычныя паказчыкі – шырыню 19,2 см і таўшчыню 3,8–4,5 см, можна выказаць меркаванне, што яна паходзіць з канструкцыі церама, пры будаўніцтве якога выкарыстоўвалася плінфа памерамі 4–5 х 18–20 х 29,5–31 см. Напрыклад, узвядзенне Ніжняй царквы вялося з цэглы з сярэднімі памерамі 25–26,5 х 15 х 3,5–4 см, а абарончых сцен – 27–29 х 16,5–18 х 3,5–4,5 см [5, с. 18–21].

Што ў агульным датычыцца выяваў на плінфе, то даследчыкі адзначаюць эпізадычнасць іх з'яўлення, якая ўказвае на тое, што ў працэсе вырабу цаглін і пры будаўніцтве яны не адыгрывалі ніякай ролі, а хутчэй былі вынікамі фантазіі майстроў, і сёння могуць разглядацца як узоры народнага мастацтва [7, с. 31–32]. Адными з найбольш вядомых прыкладаў такіх узораў, выяўленых на тэрыторыі Беларусі, з'яўляюцца плінфы з Полацка. У 2017 г падчас археолага-рэстаўрацыйных работ на тэрыторыі Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра на плінфе канца XI – пачатку XII стст., якая была часткай старажытнай пабудовы, быў знойдзены фрагмент будаўнічага чарцяжа мяжы XI–XII стст., як мяркуецца, самога храма-пахавальні. У 2020 г. падчас раскопак паўночнай галерэі Спаса-Праабражэнскага храма былі знойдзены два фрагменты адной плінфы з выявай двух музыкаў (гусляроў) на пасцелі [3].

Падчас правядзення археалагічных даследаванняў на Замкавай гары ў Гродна ў 1940-х гг. былі знойдзены дзве плінфы з нанесенымі на паверхню выявамі: эскізам складанага плеценага арнамента і часткай нейкага "чарцяжа" [2, с. 125–126, рис. 63: 2]. У 2017 г. пад кіраўніцтвам Н. А. Кізюкевіч на месцы "Мернай ізбы" былі даследаваны рэшткі жылой пабудовы апошняй чвэрці XIV ст. Печ гэтай пабудовы была ўзведзена з другасным выкарыстаннем плінфы XII ст., а на адной з цаглін быў змешчаны надпіс – цытата з Псалма 45: 6, якая павінна была абараніць пабудову (верагодна, Ніжнюю царкву) ад разбурэння, выкліканага прыроднымі катаклізмамі [1]. Таксама з раскопак на Замкавай гары паходзіць плінфа трапецыяпадобнай формы з геаметрычным арнаментам. Плінфа з сюжэтнай выявай з'яўляецца першай знаходкай такога роду і дапаўняе гарадзенскую калекцыю.

Плінфа з сюжэтнай выявай, знойдзеная на Замкавай гары ў Гродна, з'яўляецца ўнікальным прыкладам вобразнага мыслення і мастацтва людзей старажытнарускага перыяду. Падобныя знаходкі на тэрыторыі Беларусі пакуль былі вядомыя толькі з Полацка. Такія артэфакты дапамагаюць нам сёння лепей зразумець, як уяўлялі сабе навакольны свет нашыя продкі 900 гадоў таму.

### Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Виноградов, А. Ю., Гиппиус А. А., Кизюкевич Н. А. Надпись на плинфе из Гродно (Пс 45: 6) в контексте византийско-русских эпиграфических связей // Slovene. 2020. – Vol. 9, № 1. – С. 412–422.
2. Воронин, Н. Н. Древнее Гродно (по материалам археологических раскопок 1932–1949 гг.) / Н. Н. Воронин // Материалы и исследования по археологии СССР; № 41. Материалы и исследования по археологии древнерусских городов ; Т. 3. – 1954. – 240 с.
3. Коц, А. Л. Музычная культура Полацка XI-XIX стст. (па матэрыялах археалагічных раскопак) / А. Л. Коц // Вестн. Полоцкого гос. Ун-та. Сер. А, Гум. науки. – 2022. – № 1. – С. 21–25.
4. Трусаў, А. А. Старонкі мураванай кнігі / А. А. Трусаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 191 с.
5. Трусаў, А. А. Стары замак у Гродна XI–XVIII стст. Гісторыка-археалагічны нарыс / А. А. Трусаў, В. Е. Собаль, Н. І. Здановіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 155 с.
6. Трусаў А. А. Плінфа / А. А. Трусаў // // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя. У 2 т. Т. 2. Л-Я / рэдкал. : Т. У. Вялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – С. 193–194.
7. Раппопорт, П. А. Строительное производство Древней Руси (X–XIII вв.) / П. А. Рапапорт. – СПб. : Наука, 1994. – 158, [2] с., [1] л.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова



**Мал. 1**. Плінфа з сюжэтнай выявай з Замкавай гары ў Гродна.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова